**16 сакавіка выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных**

# АДДАДЗІМ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА КАНДЫДАТАЎ БЛОКА КАМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 9 (738) ● Пятніца, 14 сакавіка 1969 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXII

## НАШЫ КАНДЫДАТЫ



*Калектывы працоўных, партыйныя і грамадскія арганізацыі Ленінскага раёна па першаму выбарчаму ўчастку вылучылі дастойных кандыдатаў у гарадскі і раённы Саветы дэпутатаў працоўных. Усе яны маюць вялікі жыццёвы вопыт, карыстаюцца заслужаным аўтарытэтам і павагай таварышаў па рабоце.*

*Інеса Міхайлаўна КВАШНІНА ў 1948 годзе набыла спецыяльнасць медыка, пасля закончыла Магілёўскі педінстытут і на працягу сямі год працавала ў школах рэспублікі, затым была назначана загадчыкам Фрунзенскага райана горада Мінска. Партыйныя органы рэкамендуюць Інесу Міхайлаўну ў ВПШ, пасля заканчэння якой яна працуе інструктарам ЦК КП Беларусі, з верасня 1967 года — намеснік старшыні выканкома Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных. Праз дзень мы будзем галасаваць за выбранне яе дэпутатам гарадскога Савета.*

*Кандыдатамі ў дэпутаты Ленінскага раённага Савета вылучаны загадчыца раённага аддзела аховы здароўя Дар'я Фёдараўна СКАРАПАНАВА, старшы прадавец магазіна № 31 Мінпрамторга Клаўдзія Аляксандраўна ШАБЛОЎСКАЯ, мадэльшчык завода імя Кастрычніцкай рэвалюцыі Мікалай Паўлавіч ПАКАЦІЛАЎ і кіраўнік групы трэста «Аргтэхбудматэрыялаў» Яўгенія Мікалаеўна БАНДАРЭНКА. Гэта выдатныя спецыялісты і разам з тым вядомыя ў Ленінскім раёне актывісты партыйнай і камсамольскай арганізацый, сціплыя і працавітыя людзі, якія чула адносяцца да запатрабаванняў працоўных.*

*На сустрэчах з выбаршчыкамі І. М. Квашніна, Д. Ф. Скарапанава. К. А. Шаблоўская, М. П. Пакацілаў, Я. М. Бандарэнка падзякавалі за высокае давер'е і абяцалі добрасумленна выконваць свае пачэсныя дэпутацкія абавязкі.*

*НА ЗДЫМКАХ: (злева направа) І. М. Квашніна, Д. Ф. Скарапанава, К. А. Шаблоўская, М. П. Пакацілаў, Я. М. Бандарэнка.*

Фота *Д. Прэса* і *М. Нічыпарэнкі.*

## ПРЫЕМНЫЯ КЛОПАТЫ

У гэтыя апошнія перад выбарамі дні асабліва многа клопатаў у агітатараў. У нашым універсітэце іх работай кіруе асістэнт з гістфака Н. І. Мініцкі. Ён праверыў, ці давялі яго падначаленыя да ведама кожнага выбаршчыка неабходнасць прыняць актыўны ўдзел у фарміраванні органаў народнай улады, ці добра пазнаёмілі іх з біяграфіямі кандыдатаў. Дарэчы, можна было і не правяраць — партком накіраваў у агіткалектыў добрасумленных таварышаў, падрыхтаваных для правядзення гэтай важнай палітычнай кампаніі. Вось адзін з іх — кандыдат у члены КПСС, аспірант кафедры філасофіі і логікі Дзмітрый Якаўлевіч Смаль. Па некалькі разоў ён наведаў кожную сям'ю, правёў дзесяткі гутарак з выбаршчыкамі. Малады камуніст своечасова падрыхтаваў спісы і запрошваў рабочых і служачых на кожнае мерапрыемства, якое праводзілася на агітпункце або ў клубе выбарчага ўчастка.

Цяпер у праслаўленым калектыве Мінскага ордэна Леніна аўтамабільнага завода добра ведаюць Дзмітрыя Якаўлевіча і з удзячнасцю гавораць аб яго палітычнай рабоце. Такіх агітатараў ва універсітэце шмат, і ўсім ім хочацца пажадаць далейшага поспеху ў рабоце, вучобе. Хочацца таксама выказаць упэўненасць, што набыты за апошнія два месяцы вопыт грамадскай работы будзе імі пашырацца і ўзбагачацца.

**Л. ЗЕМЛЯКОЎ.**

## САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ

Закончыўся першы этап выбарчай кампаніі. За прайшоўшы час галаўная партыйная арганізацыя гістфака, агітпункт і агіткалектыў універсітэта правялі вялікую работу сярод працоўных выбарчага ўчастка № 1 Ленінскага раёна. Ва універсітэце быў арганізаваны цыкл лекцый аб жыцці і дзейнасці У. І. Леніна, савецкай дэмакратыі, гераічнай гісторыі нашай дзяржавы і яе велічных поспехах, аб слаўных юбілеях рэспублікі і па іншых актуальных тэмах. У клубе сістэматычна дэманстраваліся мастацкія і хранікальна-дакументальныя фільмы. Выбаршчыкі мелі магчымасць пабываць у гасцях у вучоных, студэнтаў, паглядзець канцэрты артыстаў рэспублікі, сустрэцца з Героямі Савецкага Саюза, атрымаць кваліфікаваныя юрыдычныя кансультацыі. Яны засталіся задаволенымі дакладамі кандыдата гістарычных навук А. І. Кажушкова, выкладчыка В. С. Клімовіча і іншых.

Наш калектыў не пакінуў без увагі ні аднаго выбаршчыка. Агітатары праводзілі гутаркі па месцы жыхарства, растлумачвалі сутнасць савецкай выбарчай сістэмы, добра пазнаёмілі працоўных з кандыдатамі ў дэпутаты. Інтарэсы выбаршчыкаў добра ўлічаны і агітпунктам. Так, напрыклад, для аматараў класічнай музыкі была арганізавана лекцыя-канцэрт на тэму «Чаму не старэе Бах». Вялікую цікавасць выклікала сустрэча з вядучымі мадэльерамі рэспублікі. А вось выбаршчыкі — аматары спорту—доўга будуць памятаць сустрэчу з намеснікам старшыні Камітэта па справах фізкультуры і спорту пры Савеце Міністраў БССР заслужаным трэнерам СССР Г. М. Бакуном. На працягу амаль дзвюх гадзін ён расказваў аб развіцці спорту ў нашай рэспубліцы, Алімпійскіх гульнях у Мехіка і поспехах беларускіх спартсменаў на гэтых адказных міжнародных спаборніцтвах.

5 сакавіка... Актавая зала біялагічнага факультэта перапоўнена. Сюды прыйшлі выбаршчыкі, каб сустрэцца з кандыдатамі ў дэпутаты. Выступленне кожнага з іх было выслухана з вялікай цікавасцю. Прысутныя запэўнілі, што аднадушна аддадуць свае галасы за кандыдатаў блоку камуністаў і беспартыйных.

Для выканання грамадзянскага доўгу ва універсітэце створаны ўсе ўмовы. У святочным убранні корпус біялагічнага факультэта, дзе будуць праходзіць выбары. Сёння заканчваюцца апошнія работы — рыхтуецца зала для галасавання, кабіны. У дзень выбараў на выбарчым участку будуць гучаць песні, музыка, калектывы мастацкай самадзейнасці дадуць вялікі канцэрт.

Усе на выбары, дарагія таварышы! Аднадушна аддадзім свае галасы за дастойных кандыдатаў народа!

**І. СТАДУБ,**
**І. РЭКУЦ,**
аспіранты

## ХВАЛЮЮЧАЯ ПАДЗЕЯ

16 сакавіка я буду першы раз галасаваць. Гэта важная падзея ў маім жыцці. Прыемна адчуваць, што ты становішся паўнапраўным грамадзянінам краіны.

Я вельмі ганаруся і разам з тым хвалююся. З радасцю аддам свой голас за дастойных людзей, якія служаць прыкладам для нашай моладзі.

Я вельмі шчаслівая, што жыву ў такой цудоўнай краіне, дзе кожнаму даецца права ўдзельнічаць у кіраўніцтве дзяржавай.

**Л. ФЕДЧАНКА,**
**студэнтка першага курса хімфака.**

## ПАШЫРАЮЦЦА СУВЯЗІ, МАЦНЕЕ ДРУЖБА

*У НАШЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ СТВОРАНА АДДЗЯЛЕННЕ ТАВАРЫСТВА САВЕЦКА-БАЛГАРСКАЙ ДРУЖБЫ*

З кожным годам мацнеюць і развіваюцца сяброўскія сувязі паміж працоўнымі Народнай Рэспублікі Балгарыі і Беларускай ССР. Вялікі ўклад у гэта ўносіць і калектыў нашага універсітэта. У снежні 1966 года паміж нашым і Сафійскім універсітэтамі было заключана пагадненне аб навуковым супрацоўніцтве. У адпаведнасці з ім за апошнія два гады ў нас пабывалі сапраўдны член Балгарскай Акадэміі навук Дзмітрый Косеў, дэкан фізічнага факультэта Сафійскага універсітэта прафесар М. Барысаў, дэкан геаграфічнага факультэта прафесар М. Іваноў, прафесар Х. Іваноў і іншыя. Балгарскія вучоныя прынялі актыўны ўдзел у рабоце IV міжвузаўскай канферэнцыі гісторыкаўславістаў, якая праходзіла ў нашым універсітэце. Беларусы цёпла прынялі прафесараў А. Мілчава, С. Русакіева, дацэнта Х. Несцерава. Яны пазнаёміліся і з універсітэтам, і з нашым цудоўным горадам.

У сваю чаргу з вопытам работы Сафійскага універсітэта падрабязна пазнаёміўся наш рэктар акадэмік А. Н. Сеўчанка. У гасцях у балгарскіх калег пабывалі і выступілі перад імі з лекцыямі член-карэспандэнт Акадэміі педагагічных навук СССР С. А. Умрэйка, загадчык кафедры дацэнт М. П. Халімановіч, дэкан гістфака П. З. Савачкін, прафесар з матфака У. П. Платонаў, дацэнт з гістфака Д. Б. Мельцар і іншыя. У Сафію выязджалі на практыку нашы студэнты-хімікі, а ў нас такую ж практыку праходзілі балгарскія студэнты. Шырокі абмен навуковай літаратурай вядзецца паміж бібліятэкамі.

З мэтай далейшага ўмацавання дружбы і развіцця навуковага супрацоўніцтва ў нашым універсітэце створана аддзяленне Таварыства савецка-балгарскай дружбы. Старшынёй праўлення на ўстаноўчым сходзе выбран рэктар універсітэта акадэмік АН БССР А. Н. Сеўчанка. Праўленне абмеркавала і зацвердзіла план работы аддзялення на 1969 год.

Сёння мы прысвячаем старонку газеты развіццю савецка-балгарскай дружбы, сяброўскім сувязям нашага калектыву з выкладчыкамі і студэнтамі Сафійскага універсітэта.

## НЕЗВЫЧАЙНЫ ДЗЕНЬ

**Дзень выбараў — асаблівы для многіх студэнтаў другога курса факультэта журналістыкі. Амаль палова з іх упершыню будзе трымаць у руках выбарчыя бюлетэні. Таму і хваляванні — асаблівыя, незвычайныя.**

**З нецярплівасцю чакаюць гэтага дня Вольга Кірылава і Галя Корбут.**

**— Гэта ж пацвярджэнне нашай сталасці, самастойнасці, — гавораць яны. — Адчуваеш адказнасць за ўсё, даручанае табе.**

**Многія студэнты курса прынялі ўдзел у рабоце агітпункта, які знаходзіцца ў нашым корпусе. Слова «агітатар» стала прывычным і блізкім для Алі Дзяўга, Раі Жардзецкай, Люды Лясковай, Віці Жарыкава і многіх іншых. Яны разносілі запрашальныя білеты выбаршчыкам, арганізавалі дзяжурства на выбарчым участку. Актыўны ўдзел прынялі яны і ў падрыхтоўцы ўрачыстага вечара сустрэчы з кандыдатамі, які адбыўся 4 сакавіка.**

**Са святам вас, аднакурснікі! У добры час!**

**З. ШЭЙНА,**
**студэнтка.**

# ЛЕНІНСКАМУ ЮБІЛЕЮ—ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ!



## ЗВАРОТ ДА ПРАФЕСАРАЎ, УСІХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ, АСПІРАНТАЎ, СТУДЭНТАЎ І СУПРАЦОЎНІКАЎ

У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна на прадпрыемствах і транспарце, у будаўнічых арганізацыях, у калгасах і саўгасах, у школах, вышэйшых навучальных і навуковых установах праводзяцца грамадскія агляды па культуры вытворчасці і ахове працы. Лепшым падарункам нашага універсітэта сваёй краіне у гонар ленінскага юбілею будзе добрая пастаноўка вучэбна-выхаваўчай і навукова-даследчай работы на факультэтах, кафедрах, у лабараторыях, аддзелах і вучэбных групах.

Рэктарат, партком, мясцком, прафком і камітэт ЛКСМБ універсітэта звяртаюцца з заклікам да прафесараў, усіх выкладчыкаў, аспірантаў, студэнтаў і супрацоўнікаў актыўна ўключыцца ў выкананне мерапрыемстваў па павышэнню культуры і эстэтыкі вытворчасці, стварэнню бяспечных умоў працы, іх значнаму паляпшэнню і аздараўленню.

РЭКТАРАТ ПАРТКОМ МЯСЦКОМ ПРАФКОМ КАМІТЭТ КАМСАМОЛА

## УМОВЫ ГРАМАДСКАГА АГЛЯДУ

*ПА КУЛЬТУРЫ ВЫТВОРЧАСЦІ І АХОВЕ ПРАЦЫ Ў БЕЛАРУСКІМ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА, ПРЫСВЕЧАНАГА 100-ГОДДЗЮ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ У. І. ЛЕНІНА*

### АРГАНІЗАЦЫЯ АГЛЯДУ

У грамадскі агляд па павышэнню культуры, эстэтыкі вытворчасці і ахове працы ўключаецца ўвесь прафесарска-выкладчыцкі састаў, факультэты, абслугоўваючы персанал універсітэта і вучэбныя групы студэнтаў.

Грамадскі агляд арганізуецца і праводзіцца прафсаюзнай і камсамольскай арганізацыямі пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі і рэктарата універсітэта з мэтай паляпшэння работы усіх звенняў універсітэта па падрыхтоўцы і выхаванню высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Неабходна правесці шырокую растлумачальную работу сярод калектыву супрацоўнікаў і студэнтаў аб задачах і мэтах агляду, сістэматычна асвятляць ход агляду ў газеце «Беларускі універсітэт», насценных газетах і радыёперадачах.

Для арганізацыі і правядзення грамадскага агляду створана агульнауніверсітэцкая камісія.

Аналагічныя камісіі ствараюцца на факультэтах.

Пераможцамі грамадскага агляду лічацца тыя калектывы факультэтаў, кафедр, лабараторый, вучэбных груп і іншых арганізацый універсітэта, якія забяспечаць лепшае выкананне наступных паказчыкаў.

### ЗА ЛЕПШЫ ФАКУЛЬТЭТ

#### АСНОЎНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ

1. Рацыянальная арганізацыя вучэбнага працэсу.
2. Укараненне новых метадаў у вучэбна-выхаваўчую работу.
3. Забеспячэнне нармальнага стану асвятлення і вентыляцыі, захоўванне аўдыторый і кабінетаў у адпаведнасці з патрабаваннямі эстэтыкі, санітарыі і правіламі тэхнікі бяспекі.
4. Выкананне мерапрыемстваў, якія ўключаны ў Пагадненне па ахове працы, а таксама мерапрыемстваў і прапаноў, вызначаных у ходзе агляду.
5. Удзел студэнтаў, выкладчыкаў і лабарантаў у спартыўна-масавых мерапрыемствах і іх вынікі.
6. Вынікі вучэбнай работы, стан вучэбнай і вытворчай дысцыпліны.
7. Шырокае далучэнне ўсіх супрацоўнікаў факультэта да ўдзелу ў правядзенні грамадскага агляду па культуры вытворчасці і ахове працы, да кантролю за становішчам тэхнікі бяспекі і вытворчай санітарыі.

#### ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І МЕРЫ ЗААХВОЧВАННЯ

Колькасць месц для пераможцаў—3.

Матэрыялы для падвядзення вынікаў грамадскага агляду прадстаўляюцца ў мясцком вучэбнай і адміністрацыйна-гаспадарчай часткай універсітэта, камісіямі па грамадскаму агляду.

Факультэту, занятаму першае месца, уручаюцца пераходны Чырвоны сцяг універсітэта і дыплом.

Факультэтам, заняўшым другое і трэцяе месцы, уручаюцца Ганаровыя граматы універсітэта.

### ЗА ЛЕПШУЮ КАФЕДРУ

#### АСНОЎНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ

1. Узорнае выкананне плана вучэбнай і навукова-даследчай работы.
2. Правядзенне выхаваўчай работы са студэнтамі.
3. Пастаяннае паляпшэнне матэрыяльнай базы навучання і захаванне яе ў належным стане.
4. Узорны стан картатэкі вучэбнай і навуковай літаратуры.
5. Высокая працоўная дысцыпліна, добрасумленныя адносіны супрацоўнікаў кафедры да сваіх службовых абавязкаў.
6. Поўнае і правільнае выкарыстанне сродкаў, якія запланаваны на мерапрыемствы па ахове працы.
7. Удзел супрацоўнікаў кафедры ў мерапрыемствах па грамадскаму агляду.

#### ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І МЕРЫ ЗААХВОЧВАННЯ

Вынікі агляду падводзяцца факультэцкімі камісіямі, а ў адносінах да агульнауніверсітэцкіх кафедр — універсітэцкай камісіяй. Кафедры, заняўшай першае месца на факультэце, прысвойваецца званне «Лепшая кафедра факультэта» з уручэннем пераходнага вымпела і ўзнагароджаннем Ганаровай граматай універсітэта.

Агульнауніверсітэцкай кафедры, заняўшай першае месца, прысвойваецца званне «Лепшая агульнауніверсітэцкая кафедра» з уручэннем пераходнага вымпела і ўзнагароджаннем Ганаровай граматай універсітэта.

Члены кафедры, якія найбольш вызначыліся з ліку пераможцаў у грамадскім аглядзе, узнагароджваюцца каштоўнымі падарункамі або турысцкімі пуцёўкамі.

### ЗА ЛЕПШУЮ ЛАБАРАТОРЫЮ

#### АСНОЎНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ

1. Выкананне плана навукова-даследчых работ.
2. Высокі ўзровень вытворчай дысцыпліны.
3. Захаванне супрацоўнікамі лабараторыі прынцыпаў маральнага кодэксу будаўніка камунізма.
4. Публікацыя ў друку вынікаў навукова-даследчых работ, укараненне іх у вытворчасць.
5. Удзел у выхаваўчай рабоце са студэнтамі.
6. Узорнае ўтрыманне і афармленне лабараторыі ў адпаведнасці з патрабаваннямі вытворчай эстэтыкі і санітарыі.
7. Забеспячэнне правіл аховы працы і тэхнікі бяспекі.

#### ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І МЕРЫ ЗААХВОЧВАННЯ

Вынікі падводзяцца факультэцкімі камісіямі грамадскага агляду і дакладваюцца на прафсаюзным сходзе.

Лабараторыі, якая заняла першае месца, уручаецца пераходны вымпел і Ганаровая грамата універсітэта. Таварышы, якія найбольш вызначыліся з ліку пераможцаў агляду, узнагароджваюцца каштоўнымі падарункамі або турысцкімі пуцёўкамі.

### ЗА ЛЕПШУЮ ГРУПУ АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧАЙ ЧАСТКІ

Электрыкі, вадаправодчыкі, столяры, муляры, шафёры, абслугоўваючы персанал вучэбных карпусоў і інтэрнатаў, дворнікі, работнікі вучэбнай майстэрні, афсетнай лабараторыі, бібліятэкі, бухгалтэрыі універсітэта.

#### АСНОЎНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ

1. Барацьба за высокі ўзровень працоўнай дысцыпліны і грамадскага парадку.
2. Дакладнае забеспячэнне вучэбнага працэсу і выканання навукова-даследчай работы.
3. Пастаяннае ўтрыманне вытворчых памяшканняў, вучэбных карпусоў, інтэрнатаў і тэрыторыі універсітэта ў адпаведнасці з патрабаваннямі эстэтыкі і санітарыі.
4. Узорнае ўтрыманне тэхнікі, інструментаў і абсталявання.
5. Арганізацыя належнай аховы маёмасці універсітэта.
6. Удасканаленне прафесіянальнага майстэрства і агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі членаў групы.
7. Прытрымліванне прынцыпаў маральнага кодэксу будаўніка камунізма.
8. Поўнае і мэтанакіраванае выкарыстанне сродкаў, якія запланаваны на мерапрыемствы па ахове працы, своечасовае забеспячэнне працаўнікоў спецвопраткай, абуткам і сродкамі індывідуальнай аховы па існуючых нормах.
9. Арганізацыя работы па павышэнню ведаў у галіне аховы працы, правядзенню сістэматычнага навучання, атэстацыі, інструктажу па тэхніцы бяспекі; забеспячэнне правіламі, інструкцыямі, папераджальнымі надпісамі і іншымі сродкамі нагляднай агітацыі, стварэнне кабінетаў і куткоў па тэхніцы бяспекі.

#### ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І МЕРЫ ЗААХВОЧВАННЯ

Вынікі грамадскага агляду груп падводзяцца камісіяй адміністрацыйна-гаспадарчай часткі і абмяркоўваюцца на агульным прафсаюзным сходзе арганізацыі.

Адбор кандыдатаў на прысваенне звання лепшага рабочага (служачага) па прафесіі праводзіцца прафбюро сумесна з адміністрацыяй.

Групе, якая заняла першае месца па выніках грамадскага агляду, уручаецца пераходны вымпел і Ганаровая грамата універсітэта.

Лепшыя супрацоўнікі па выніках агляду ўзнагароджваюцца памятнымі падарункамі і пуцёўкамі ў дамы адпачынку.

### ЗА ЛЕПШУЮ АКАДЭМІЧНУЮ ГРУПУ

#### АСНОЎНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ

1. Удзел студэнтаў у грамадскай рабоце.
2. Удзел студэнтаў групы ў гуртках мастацкай самадзейнасці.
3. Спартыўна-масавая работа.
4. Культура быту ва універсітэце і ў інтэрнатах (ахайнасць студэнтаў, належная падрыхтоўка аўдыторый да заняткаў і падтрыманне ў іх санітарных умоў, ветлівыя адносіны, захаванне дзяржаўнай маёмасці і г. д.).
5. Удзел студэнтаў у навукова-даследчай рабоце і лекцыйнай прапагандзе.

#### ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І МЕРЫ ЗААХВОЧВАННЯ

Вынікі грамадскага агляду груп падводзяцца камісіямі факультэта і аб'яўляюцца на агульным прафсаюзным сходзе.

Лепшую студэнцкую групу універсітэта вызначае агульнауніверсітэцкая камісія грамадскага агляду.

Групе, якая заняла першае месца на факультэце, уручаецца пераходны вымпел і Ганаровая грамата універсітэта. Лепшым студэнтам гэтай групы ўручаюцца каштоўныя падарункі або турысцкія пуцёўкі.

Лепшая студэнцкая група універсітэта ўзнагароджваецца бясплатнай калектыўнай турысцкай паездкай.

Агульныя вынікі грамадскага агляду падводзяцца на пашыраным пасяджэнні мясцкома сумесна з рэктаратам, парткомам, камітэтам ЛКСМБ і прафкомам універсітэта пасля заканчэння кожнага вучэбнага семестра і ў канцы каляндарнага года.

Умовы грамадскага агляду па культуры і эстэтыцы вытворчасці і ахове працы адобраны рэктаратам, парткомам, мясцкомам, прафкомам і камітэтам камсамола універсітэта.

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ! ШЫРЭЙ РАЗГОРНЕМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ЗА ВЫСОКУЮ КУЛЬТУРУ ВЫТВОРЧАСЦІ І ЎЗОРНУЮ АХОВУ ПРАЦЫ, ЗА ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ 100-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ У. І. ЛЕНІНА!



# КРЫЛЛЕ НАРОДАЎ-БРАТОЎ

18 сакавіка савецкі і балгарскі народы адзначаюць 18-ю гадавіну Дагавору аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе паміж СССР і Народнай Рэспублікай Балгарыяй.

Прайшоўшыя гады пераканаўча даказалі важнасць і жыццёвасць гэтага дагавору для абедзвюх краін, якія паспяхова здзяйсняюць велічныя праграмы сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва. За гэтыя гады Балгарыя выйшла на шырокую дарогу ўсебаковага эканамічнага пад'ёму. Нацыянальны даход краіны павялічыўся амаль у 5 разоў, а вытворчасць прамысловай прадукцыі — амаль у 30 разоў. Цяпер менш чым за два тыдні балгарская прамысловасць выпускае столькі прадукцыі, колькі буржуазная Балгарыя выпусціла за ўвесь 1939 год.

Не могуць не выклікаць захаплення поспехі сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. Сярэдняя ўраджайнасць пшаніцы ў цэлым па краіне ў 1967 годзе перавысіла 30 цэнтнераў з гектара, а ў Талбухінскай акрузе з кожнага са 120 тысяч гектараў быў атрыман самы высокі ў свеце ўраджай — у сярэднім па 46,3 цэнтнера зерня.

Адчувальны дасягненні балгарскага народа ва ўсіх сферах культурнага жыцця. Кожны чацвёрты жыхар краіны вучыцца. У 26 вышэйшых навучальных установах займаецца больш 80 тысяч студэнтаў. Толькі ў 1968 годзе вну выпусцілі звыш 13.000 маладых спецыялістаў. Паспяхова развіваецца навука. У Балгарыі працуюць 39 дзяржаўных тэатраў, у тым ліку 5 оперных, 7 сімфанічных аркестраў, 3.044 кінатэатры, 11.047 бібліятэк, 135 дзяржаўных музеяў, 4.520 народных чытальняў (палацаў культуры).

Балгарскія працоўныя заўсёды падкрэсліваюць, што імклівы пад'ём эканомікі, росквіт культуры, навукі і мастацтва народа былі б немагчымыя без сацыялістычнай садружнасці, без усебаковай дапамогі Савецкага Саюза. У братняй Балгарыі пры тэхнічным садзейнічанні СССР узведзена 160 буйных прамысловых аб'ектаў. Гэтыя прадпрыемствы даюць 25 працэнтаў балгарскай вытворчасці чорных металаў, 70 працэнтаў каляровых металаў, 100 працэнтаў судоў, 55 працэнтаў вырабаў хімічнай прамысловасці, 70 працэнтаў электраэнергіі краіны.

Нядаўна ў Сафіі выйшла з друку праца прафесара Грыгора Папісанава «Эканамічныя адносіны паміж НРБ і СССР». Вядомы вучоны на аснове дакладнага навуковага аналізу лічбовых даных, з'яў і падзей прыходзіць да вываду: умацаванне і развіццё балгара-савецкай садружнасці не толькі ўзаемавыгаднае, але і з'яўляецца гістарычнай неабходнасцю, рашаючым фактарам паспяховага будаўніцтва сацыялізма і камунізма ў Балгарыі.

Непарушная дружба, што звязвае балгарскі народ з народамі Савецкага Саюза, пастаянна мацнее. Новым важным крокам у развіцці адносін паміж нашымі краінамі з'яўляецца падпісанне 12 мая 1967 года новага Дагавору аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе тэрмінам на 20 год.

Вялікі ўклад у справу ўмацавання савецка-балгарскіх сяброўскіх сувязей і супрацоўніцтва разам з усімі народамі Савецкага Саюза ўносяць працоўныя Беларускай ССР. Наша рэспубліка займае значнае месца ў эканамічных сувязях. За перыяд з 1965 па 1967 год тавараабарот паміж БССР і НРБ павялічыўся амаль у 5 разоў. У Балгарыі высокую ацэнку атрымалі беларускія станкі і аўтамашыны, меліярацыйная тэхніка, электронна-вылічальныя машыны, шарыкападшыпнікі, гадзіннікі. На палях Балгарыі працуюць больш 12 тысяч трактараў «Беларусь».

Тодар Жыўкаў, будучы ў Мінску, гаварыў: «Мы ў Балгарыі добра ведаем аб Мінскім трактарным заводзе. Балгарскія сяляне з удзячнасцю адклікаюцца аб беларускіх машынах, што працуюць на палях Балгарыі».

У сваю чаргу вялікая колькасць прамысловых вырабаў і тавараў народнага ўжытку ўвозіцца з Балгарыі ў Беларусь.

Многія калектывы беларускіх заводаў і фабрык абменьваюцца вытворчым вопытам, аказваюць адзін аднаму тэхнічную дапамогу. Агульнавядома, напрыклад, роля Мінскага ордэна Леніна трактарнага завода ў стварэнні балгарскага трактарабудавання. Дзякуючы вялікай дапамозе беларускіх спецыялістаў, тэхнічнай дакументацыі, перададзенай балгарскім сябрам, яны ў кароткі тэрмін асвоілі вытворчасць трактараў «Балгар», якія з'яўляюцца мадыфікацыяй трактара «Беларусь».

Пастаянныя сувязі ўстанавіліся паміж калектывамі Мінскага станкабудаўнічага завода імя Кірава і завода металарэжучых станкоў горада Перніна, Полацкага хімічнага камбіната і нафтахімічнага камбіната горада Бургаса, калгаса «Рассвет» Кіраўскага раёна і ТКЗХ «Боцеўградская камуна», паміж працоўнымі Магілёўскай вобласці БССР і Габраўскай акругі НРБ. Сябры па-братэрску дзеляцца вопытам, спаборнічаюць за высокія паказчыкі ў рабоце.

Паміж Беларуссю і Балгарыяй паспяхова развіваюцца навуковыя і культурныя сувязі. Вялікую любоў і прызнанне балгарскіх чытачоў заваявала беларуская літаратура. Толькі за апошнія гады Сафійскае выдавецтва «Народная культура» выпусціла на балгарскай мове аднатомнікі твораў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Танка, П. Броўкі, А. Куляшова, П. Панчанкі, Н. Гілевіча. Выйшлі на балгарскай мове раман І. Шамякіна «Сэрца на далоні», апавяданні Я. Брыля, аповесці В. Быкава, п'есы А. Макаёнка, А. Маўзона.

У той жа час на беларускай мове выдадзены многія творы балгарскіх пісьменнікаў і паэтаў. У 1965 годзе выйшаў зборнік вершаў 63-х сучасных балгарскіх паэтаў «Ад стром балканскіх», у 1967 годзе — зборнік апавяданняў «Скарбніца». Вялікая заслуга ў папулярызацыі твораў балгарскай літаратуры належыць дацэнту нашага універсітэта Нілу Гілевічу. Балгарскі ўрад высока ацаніў заслугі Н. Гілевіча, узнагародзіўшы яго ордэнам Кірыла і Мяфодзія І ступені.

Шырокі і разнастайны характар носіць абмен у галіне мастацтва. Вялікае значэнне для ўмацавання дружбы паміж нашымі народамі, для ўзаемнага азнаямлення з дасягненнямі ў сацыялістычным будаўніцтве, культурным жыцці нашых рэспублік мела дэкада балгарскай культуры ў Беларусі і дэкада беларускай культуры ў Балгарыі, якія праходзілі восенню 1965 года. Узаемнае правядзенне дэкад культуры вылілася ў свята дружбы і любві брацкіх беларускага і балгарскага народаў.

Мне пашчаслівілася некалькі разоў пабываць у Балгарыі. І кожны раз выклікалі захапленне дасягненні балгарскага народа. Але самае галоўнае ўражанне — гэта гарачая любоў балгарскіх сяброў да савецкіх людзей. Усюды, калі размова заходзіць аб адносінах паміж нашымі краінамі, чуеш: «Вечная дружба!».

**Д. МЕЛЬЦАР,**
дацэнт, член праўлення беларускага аддзялення Таварыства савецка-балгарскай дружбы.

*На здымках фотажурналіста Д. Прэса вы бачыце балгарскіх вучоных у час знаходжання ў нашым універсітэце.*

# МІНСК—САФІЯ

Мінулым летам група студэнтаў хімічнага факультэта пад кіраўніцтвам доктара хімічных навук, прафесара І. Р. Цішчанкі праходзіла вытворчую практыку ў Сафійскім універсітэце. А ў лістападзе да нас прыехала група балгарскіх студэнтаў на вытворча - азнаямленчую практыку. Госці знаёміліся з гісторыяй нашага універсітэта і хімічнага факультэта, з пастаноўкай вучэбнай і навукова-даследчай работы на факультэце. Усе студэнты з Сафіі ў абавязковым парадку адпрацавалі спецыяльны лабараторны практыкум, у які ўвайшлі работы па электроннай мікраскапіі, полымнай фатаметрыі і высокамалекулярнай тэрмадынаміцы.

Не менш важнай задачай практыкі балгарскіх студэнтаў было знаёмства з бытам, працоўным і культурным жыццём нашага народа. Студэнты пабывалі на экскурсіі ў Беларускім тэхналагічным інстытуце, наведалі Інстытут агульнай і неарганічнай хіміі і Інстытут фізіка-арганічнай хіміі Акадэміі навук БССР, дзе яны азнаёміліся з тэматыкай навукова-даследчых работ і асноўнымі праблемамі, над якімі працуюць беларускія вучоныя.

Нашым гасцям была прадастаўлена магчымасць наведаць Мінскі трактарны завод і зрабіць экскурсію ў горад Салігорск. Там яны пабывалі ў шахце, дзе здабываюць сільвініт, на абагачальнай фабрыцы Салігорскага калійнага камбіната № 1.

Цікавым для іх было наведанне Дома-музея І з'езда РСДРП, музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, кінатэатраў і тэатраў сталіцы рэспублікі. Асабліва спадабалася балгарскім сябрам камедыя Я. Купалы «Паўлінка» ў Беларускім акадэмічным тэатры імя Я. Купалы.

Разнастайным было знаёмства балгарскіх студэнтаў з нашым горадам. У час прагулак і экскурсій яны аб многім даведаліся з гісторыі горада, наведалі памятныя месцы. Студэнты пабывалі на плошчах Перамогі і Леніна, агледзелі жылы мікраграён Зялёны Луг, наведалі брацкую магілу на вуліцы Талбухіна, пабывалі ля помніка загінуўшым ля вёскі Малы Трасцянец.

Вялікай падзеяй для балгарскіх студэнтаў была экскурсія ў Маскву, Ленінград і Рыгу. У Маскве група зрабіла экскурсію па горадзе, наведала музей У. І. Леніна, Крэмль, Аружэйную палату. Найбольш моцнае ўражанне выклікаў у нашых гасцей горад на Няве — Ленінград, унікальнае багацце Эрмітажа.

За час практыкі балгарскія госці вельмі блізка пазнаёміліся з жыццём нашых студэнтаў. Асабліва сяброўскія адносіны ўстанавіліся са студэнтамі чацвёртага і пятага курсаў нашага факультэта.

Знаёмячыся з работай універсітэцкай камсамольскай арганізацыі, група балгарскіх студэнтаў пабывала ў камітэце камсамола. У час працяглай гутаркі яны атрымалі адказы на цікавячыя пытанні па гісторыі універсітэта, рабоце універсітэцкай камсамольскай арганізацыі.

Балгарскія студэнты засталіся задаволенымі тым прыёмам, які ім аказалі ў нашым універсітэце, адносінамі да іх савецкіх людзей — студэнтаў, выкладчыкаў, супрацоўнікаў, проста знаёмых.

Мы імкнемся і надалей умацоўваць і пашыраць сяброўскія адносіны, якія склаліся паміж хімічнымі факультэтамі Беларускага і Сафійскага універсітэтаў.

**В. СІДЭРКА,**
**асістэнт кафедры аналітычнай хіміі, кіраўнік групы балгарскіх студэнтаў-практыкантаў.**

# ОДА САЮЗУ САВЕЦКІХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК

**Гарачы водгук у балгарскіх чытачоў выклікаў верш паэта Арліна Арлінава «Ода Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік». Першы сакратар Цэнтральнага Камітэта Балгарскай Камуністычнай партыі, Старшыня Савета Міністраў Народнай Рэспублікі Балгарыі Тодар Жыўкаў у пісьме да паэта, якое было змешчана ў многіх балгарскіх газетах, пісаў: «Паважаны таварыш Арлінаў, хачу табе падзякаваць за сваё неспакойнае грамадзянскае і партыйнае пачуццё, за тваю чуйнасць паэта-камуніста да падзей і праблем, якія хвалююць наш народ. Асабліва хачу павіншаваць цябе з тваёй «Одай СССР», апублікаванай у газеце «Работническо дело». Гэты таленавіты, палымяны, адкрыта партыйны верш выклікаў шырокі водгук у душах людзей і зброяй паэзіі ваюе за рашэнне галоўнай палітычнай задачы часу, умацаванне пачуццяў братэрскай любві да Савецкага Саюза. Моцна цісну тваю руку і ад сэрца жадаю табе новых поспехаў на ніве грамадзянскай паэзіі».**

**Прапануем увазе чытачоў верш Арліна Арлінава ў перакладзе дацэнта нашага універсітэта паэта Н. ГІЛЕВІЧА.**

Табе мая ода,
Табе мая песня,
І сёння табе,
І заўсёды...
Усё ты павінен умець.
Усё ты павінен мець:
Танкі і ракеты,
Самалёты звышгукавыя,
Геніяльных фізікаў,
геніяльных паэтаў,
Мікрапаўправаднікі,
Розумы электронныя,
Акіянскія атамныя
падводныя лодкі,
Станкі мнагатонныя,
Чорную металургію,
Домны для выплаўкі сталі,
Хвалюючую драматургію,
Буйныя гідрацэнтралі...

Кажуць, ты «вінаваты»
ва ўсім:
У тым, што саломай
Пакрыты яшчэ дзе-нідзе
твае хаты,
Што дакупліваеш чырвоныя
таматы,
Што не ўслед пераймаеш
парыжскую моду,
І нават у тым, што пішу
гэту оду.

Божа ласкавы!
Матухна мілая!
Адкуль жа бярэцца,
скажы мне,
магутная сіла —
Папрок сустракаць ласкай,
Удар — ударам,
Пагрозу — насунутай
каскай?

Усё ты павінен умець.
Усё ты павінен мець:
Нафту,
брыльянты
і золата злізткі,

*(Заканчэнне на 4-й стар.).*







# ОДА САЮЗУ САВЕЦКІХ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ РЭСПУБЛІК

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).*

Узводных талковых
І маршалаў таленавітых.
Ты павінен далей
рэвалюцыю шырыць.
Ты павінен нястойкіх
падтрымліваць
на ўхабах,
А калі ўратаваны
тваімі салдатамі
моршчыцца і фальшывіць—
Цярпенне і стрыманасць
мець у сібірскіх маштабах.

А ці ведаюць тыя
Наваспечаныя прарокі
«святыя»
Ды красамоўцы
несамавітыя,
Што калі б ты закрыў
Свае вены адкрытыя
Хаця б на месяц,
Хаця б на год,
Хаця б на адну пяцігодку,—
І ты,
як старая Бельгія,
Чорны асфальт
Мог бы мыліць і церці
шчоткай?
А ці ведаюць тыя
Красамоўцы і прарокі
«святыя»,
Што калі б не было тваіх
дулаў,
Што калі б не было тваіх
крылаў,
Што калі б не было тваіх
грозных пляцовак
стартавых,—
І з імі размова
была б кароткая,
страшная?
Хопіць!
Хопіць!
Хопіць!
Даволі гульні няшчырай!
Меладраму разыгрываеце
дарма!
У гэтым свеце —
Азвярэлым,
лютым,
ашчэраным —
Дзвюх дарог няма!
Або тут.
Або там.
Дыялектыка ясная.
Вымераная грам у грам.

І мы ведаем ісціну хітрых
разлікаў:
За кожную прададзеную
кроплю любові—
Амерыканская пазыка.
І калі рука,
Што забіла
Кенедзі першага,
Кенедзі другога
І чорнага Кінга, негра,
Падпаліць паспрабуе
зямлю
і ваду,
і неба, —
Хто адаб'е вар'яцкі ўдар?
Хто нас абароніць? Прарок
«святы»?
Праява нябесная?
Цуд які-небудзь?
Ты!
Ты!
Ты!
Ты!
Ты будзеш самім сабою
І першы рынешся ў пекла
бою.
Твае Андрушы
нацэляць «кацюшы»,
Русыя Ванькі
пасядуць у танкі,
Твае Алёшы
Пройдуць па страшных
палях
У запыленых гімнасцёрках,
Каб застацца навек
бессмяротнымі
На далёкіх чужых пагорках.
Гэта — не жарт.
І не падман.
Дарога — адна.
Дзвюх дарог —
няма!
І хай нас лаюць.
Хай корчаць грымасу.
Такі ўжо закон нашага
часу:
Хто дружбу тваю і давер
твой страціць,
Хто здрадзіць,
СССР,
табе —
Той праўдзе вялікай
здрадзіць.
Табе мая ода,
Табе мая песня,
І сёння табе,
І заўсёды...

# Дзень за днём

## У ГОНАР ЖАНЧЫН

Цікавы вечар, прысвечаны Міжнароднаму жаночаму дню 8 Сакавіка, адбыўся ў гуманітарным корпусе. Студэнты двух факультэтаў — журналістыкі і філалагічнага — загадзя рыхтаваліся да свята. І вось гэты дзень настаў. У прэзідыуме выкладчыкі, студэнты, госці—беларускія пісьменніцы Алена Васілевіч і Эдзі Агняцвет.

Урачыстае пасяджэнне адкрыла прафесар, доктар філалагічных навук Марыя Андрэеўна Жыдовіч. Яна расказала аб жанчынах, што вечна жывыя ў памяці народа, — аб рэвалюцыянерках і ўдзельніцах Вялікай Айчыннай вайны, будаўніцах камуністычнага грамадства.

Пісьменніцы павіншавалі студэнтак са святам, пажадалі поспехаў у вучобе, шчасця, кахання і прачыталі свае творы, прысвечаныя святочнай даце.

У заключэнне намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта Уладзімір Наумчык уручыў лепшым студэнткам граматы.

У святочным канцэрце паказалі сваё майстэрства самадзейныя артысты. Гледачы шчодра надзялілі апладысментамі дзяўчат з другога курса беларускага аддзялення, якія добра спявалі. Не адсталі ад іх і сябры-трэцякурснікі. Але журналісты паднеслі прыемны сюрпрыз — стварылі свой эстрадны ансамбль. І на вечары салісты журфака выступілі ў суправаджэнні аркестра. Паланілі гледачоў Мікалай Ілюшэнка і Ала Каламіец.

Святочны вечар спадабаўся і гледачам, і артыстам.

А. КЛОК,
студэнтка.

## СТУДЭНЦКАЯ НАВУКОВАЯ

Студэнцкі навуковы гурток гістарычнага факультэта пры кафедры гісторыі БССР правёў навуковую канферэнцыю, прысвечаную 25-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Уступным словам яе адкрыў актыўны ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны дацэнт Д. Б. Мельцар. З дакладам аб гераічнай абароне Брэсцкай крэпасці выступіў студэнт С. Ціхан. П. Мястоўскі сваё даследаванне прысвяціў абарончым баям на тэрыторыі Беларусі ў чэрвені—ліпені 1941 года. Новыя цікавыя матэрыялы аб абароне Магілёва выкарыстаў у сваім дакладзе М. Вяршынін. Я. Несцяровіч прысвяціў сваё выступленне гісторыі партызанскага руху на Беларусі, а Л. Кавалёў расказаў аб «рэйкавай» вайне. Аб удзеле замежных грамадзян у партызанскім руху на Беларусі і беларусаў у руху Супраціўлення гаварылі Т. Жук і В. Касмылёў.

З вялікай цікавасцю былі праслуханы гэтыя даклады, пранізаныя думкай аб вялікай кіруючай ролі Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада ў дасягненні перамогі над ворагам.

## Заплывы «маржоў»

Напярэдадні свята Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту былі праведзены рэспубліканскі вучэбна-метадычны семінар і масавы заплыў. Звыш 100 чалавек з розных гарадоў Беларусі прынялі ў ім удзел.

Перад цудоўным будынкам палаца воднага спорту адбыўся ўрачысты парад «маржоў». Іх вітаў старшыня рэспубліканскай федэрацыі загартоўкі і зімовага плавання, выхаванец нашага універсітэта кандыдат фізіка-матэматычных навук Расціслаў Георгіевіч Жбанкоў.

А 8 сакавіка традыцыйным заплывам «маржы» своеасабліва адзначылі Міжнародны жаночы дзень. Сярод аматараў зімовага плавання былі і жанчыны. Ім уручылі граматы і падарункі.

Папулярнасць зімовага плавання няспынна расце. Хутка ў палацы воднага спорту адкрыецца цэнтральная рэспубліканская школа загартоўкі, якая будзе весці вялікую масава-аздараўленчую і спартыўна-метадычную работу. Школа прадугледжвае прыняць 600—700 чалавек. Будуць арганізаваны курсы па падрыхтоўцы інструктараў па загартоўцы для прамысловых прадпрыемстваў, навучальных устаноў, воінскіх часцей, груп дапрызыўнікоў, клубаў ДТСААФ.

А. РУКШЫН,
удзельнік зімовых
заплываў.

ФЕЛЬЕТОН

# ЯК МЫШЫ «З'ЕЛІ» ДЫСЕРТАЦЫЙНЫ МАТЭРЫЯЛ, АБО ТРЫ НЯМЫЯ СЦЭНЫ

«Веды — сіла», — сказаў некалькі стагоддзяў назад адзін з англійскіх філосафаў. Ён і не думаў, што гэтыя словы стануць крылатымі і, больш таго, імі будуць кіравацца людзі ў самых звычайных учынках. Праўда, не заўсёды і не ўсе!

Да таго ж некаторыя па-свойму разумеюць гэты канкрэтны філасофскі вывад. Яны лічаць, што ведаюць усё, таму даволі часта кіруюцца другой паловай афарызма.

Прыкладаў таму шмат. Але не аб гэтым пойдзе размова. Гутарка — аб выніках, да якіх прыводзіць такое перакананне. Але па парадку. Звернемся, як любіў гаварыць паэт Верхарн, да ўрачыстага граніту юрыспрудэнцыі.

Крымінальны кодэкс Беларускай ССР, артыкул 132: «Незаконны вобыск, незаконнае высяленне або іншыя незаконныя дзеянні, якія парушаюць недатыкальнасць жылля грамадзян, караюцца пазбаўленнем волі на тэрмін да аднаго года, або папраўчымі работамі на той жа тэрмін, або штрафам да 50 рублёў, або звальненнем з пасады, або выклікаюць прымяненні мер грамадскага ўздзеяння».

Ці ведаеш ты аб гэтым, дарагі чытач? Я бачу на тваім твары ўсмешку. Згодзен. Можна доўга і беспаспяхова шукаць чалавека, які не з'яўляецца юрыстам і добра знаёмы з крымінальным кодэксам. І гэта зусім натуральна. Аднак ёсць работнікі пэўнага профілю, людзі, як быццам далёкія па сваіх службовых абавязках ад юрыдычнай навукі і практыкі, недасведчанасць якіх у падобных пытаннях можа прывесці, мякка кажучы, да кур'ёзаў.

3-га лютага камендант універсітэцкага інтэрната, што па вуліцы Кастрычніцкай, Марыя Іванаўна Кавецкая са сваімі памочнікамі рабіла абход пакояў. Дайшлі да 540-га. Пастукалі. Ціха... Яшчэ раз пастукалі. Зноў цішыня!.. Цішыня была абсалютнай. Вось гэта і насцярожыла «чуйнага» каменданта. Невядома, што яна канкрэтна падумала аб



жыхарах гэтага пакоя, іх занятках за зачыненымі дзвярыма, але... пастукалі трэці раз... Мацней! Яшчэ мацней!!!

Цішыня паказалася падазронай, затым задзірлівай, зняважлівай...

— Ламаць!—з гневам загадала Марыя Іванаўна.

Маўчаць — значыць п'юць, а можа што-небудзь горшае робяць...

Некалькі прафесіянальных рухаў столяра—і дзверы расчыніліся. На няпрошаных гасцей здзіўлена глядзелі неадушаўлёныя рэчы. Гэта было жудасна... Шкада, што пры нямой сцэне не аказалася Гогаля — ён дапісаў бы яшчэ адзін акт да «Рэвізора».

Што рабіць? Рамантаваць замок? Усё роўна сляды ад палому застануцца... Прасіць прабачэння ў жыхароў пакоя? Адпадае: ні чын, ні ўзрост не дазваляюць.

Адно зразумела: трэба выйсці з вады сухім, а ўсе канцы схаваць у ваду. І тут Марыю Іванаўну асяніла — калісьці яна чула, што жыхары 540-га пакоя парушалі правілы супольнага жыцця —позна вечарам не пускалі у пакой прадстаўніка адміністрацыі!

Выселіць!!! Так, так! Выселіць!!!

Марыя Іванаўна — чалавек цвёрдага характару, і яе рашэнне таксама было цвёрдым. Але тут хтосьці нагадаў, што камендант не мае юрыдычнага права на гэта. Ды і падстаў ніякіх няма. Да таго ж і высяляць няма каго—прайшло некалькі гадзін, а жыхары не з'яўляліся. Забягаючы наперад, скажам, што аспіранты Мікалай Васільевіч Абабурка, Уладзімір Аляксеевіч Дудко і Уладзімір Аляксеевіч Івашкін—жыхары гэтага пакоя—былі ў камандзіроўках. Выпадак? Не інакш...

Дык дзе ж выйсце? Застаецца адно: распачаць рамонт пакоя. Слушнае рашэнне. У тэрміновым парадку небагаты аспіранцкі скарб быў перапраўлены ў кладовую. Але на ўсякі выпадак былі падрыхтаваны матэрыялы на высяленне, некаторыя з іх, зноў на ўсякі выпадак, былі датаваны нават снежнем мінулага года.

Інцыдэнт быў «вычарпаны». З пачуццём сумленна адданага доўгу Марыя Іванаўна пайшла адпачываць. На другі дзень рамонт ішоў паскоранымі тэмпамі.

Неўзабаве жыхары 540-га пачалі з'язджацца. Першым вярнуўся У. А. Івашкін. Падышоў да пакоя і... аслупянеў. (Уяві, чытач, яшчэ адну нямую сцэну!).

Праз хвіліну ў камендацкай адбыўся наступны дыялог:

— Што здарылася, Марыя Іванаўна?

— Выселілі вас, Івашкін, вось што здарылася.

— Зусім?

— Зусім.

— А дзе ж нам жыць?

—Дзе хочаце...

Пацярпеўшы хмыкнуў:

— Тады я пайшоў...

— Бывай здаровы!

Адвярнуўшыся каля парога, У. А. Івашкін спакойна абвясціў:

— Вы ведаеце, я ў суд пайшоў...

Трэцяя нямая сцэна... Праўда, яна была вельмі кароткай, бо хутка пачалася дзелавая размова, у выніку якой жыхар пайшоў... не ў пракуратуру, а пераносіць свой скарб ужо ў 329-ы пакой.

У кладоўцы, хоць усё было звалена ў кучу, нічога не сапсавалася, акрамя дробязі—кудысьці знікла значная частка дысертацыйнага матэрыялу (вынік некалькіх месяцаў працы). Можа, мышы з'елі? Але ж за паводзіны мышэй камендант не адказвае. Якія могуць быць прэтэнзіі да Марыі Іванаўны? Яна ж дабра хацела жыхарам...

Канчаткова пытанне разглядалася ў прарэктара па адміністрацыйна - гаспадарчай частцы.

Вы спытаеце: чаму ж тады фельетон паявіўся? Адказ просты: дзеля таго, каб мышы не падвялі іншых аспірантаў ці студэнтаў.

І. ГЛАДЫШАЎ.

# ЦУДОЎНАЯ БАЛГАРЫЯ

У ліку адзінаццаці студэнтаў-практыкантаў пятага курса хімфака БДУ мне давялося пабываць у мінулым годзе ў Балгарыі. Мэтай нашай паездкі было знаёмства з сучаснымі кірункамі даследаванняў у галіне хіміі, з развіццём маладой хімічнай прамысловасці рэспублікі, з культурай і бытам брацкай краіны. І, вядома, устанаўленне і ўмацаванне сяброўскіх сувязей з балгарскай моладдзю, са студэнтамі Сафійскага універсітэта. На працягу ўсяго тэрміну знаходжання ў Балгарыі універсітэт быў нашай галоўнай базай.

Балгарыя сустрэла нас ясным, сонечным надвор'ем, морам сяброўскіх усмешак.

Калі размаўляеш з балгарскімі камсамольцамі ці гуляеш па вуліцах Сафіі, разумееш, чаму ні адно са злучэнняў балгарскай арміі не ваявала супраць краін антыгітлераўскай кааліцыі, чаму ва ўсіх школах акупіраванай фашыстамі Балгарыі працягвалася вывучэнне рускай мовы. Братняя дружба і ўзаемаразуменне, сардэчная любоў да народа-вызваліцеля — вось адказ на гэта пытанне.

Мы ніколі не забудзем той сяброўскай цеплыні, якая акружала нас на кожным кроку. У незнаёмым горадзе нам лёгка было арыентавацца. Рускую мову тут ведаюць многія, і сафійцы не толькі ахвотна расказвалі, як трапіць на тую ці іншую вуліцу, але часта былі і нашымі шчырымі гідамі.

Ды і ўвогуле знаёмства з Балгарыяй было карысным і цікавым. Прыемныя ўражанні аб гэтай цудоўнай краіне застануцца ў нас надоўга.

М. МІЦКЕВІЧ,
студэнт пятага
курса хімфака.

# УВАГА!

**Камітэт камсамола БДУ імя У. І. Леніна праводзіць конкурс на лепшы праект помніка студэнтам і выкладчыкам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.**

**УМОВЫ:**

**1. Эскізы павінны быць выкананы тушшу на паперы (размер не менш 400×400).**

**2. Да эскіза прыкладаецца кароткае апісанне праекта.**

**3. Тэрмін падачы эскізаў да 1 красавіка 1969 года.**

**Пераможца конкурсу будзе ўзнагароджан грашовай прэміяй у памеры 150 рублёў.**

**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА БДУ.**

## ЧЭМПІЁНЫ РЭСПУБЛІКІ

У гімнастычнай зале галоўнага корпуса прайшло першынство вну рэспублікі па мастацкай гімнастыцы. Спартыўны гонар універсітэта абаранялі майстры спорту Т. Філонава, Н. Сакалова, Л. Ярымовіч, Т. Кіркорава, першаразрадніцы О. Елеф і Г. Дзяругіна.

Каманда нашага універсітэта аказалася мацнейшай і заняла першае месца. На другім — гімнасткі інстытута замежных моў, на трэцім — педінстытута імя А. М. Горкага (Мінск). Асабістыя месцы размеркаваліся наступным чынам: першае— у нашай Т. Філонавай, студэнткі V курса хімічнага факультэта, другое і трэцяе — у студэнтак інстытута замежных моў Т. Ціханравай і Л. Шышкінай.

## КРОК НАПЕРАД

Закончылася першынство спартыўных клубаў вну рэспублікі па хакею. Прымаючы ўдзел у гэтых спаборніцтвах, каманда БДУ зрабіла вялікі крок наперад у параўнанні з мінулым годам.

У гэтым годзе ў першынстве прыняла ўдзел каманда СКІФа, якая ўдзельнічала ў першынстве СССР па класу «Б»; вядома, яна была па-за канкурэнцыяй. Барацьба разгарнулася за другое і трэцяе месцы паміж камандамі «Тэхнолаг» (Мінск), Гомельскага педінстытута і БДУ.

Ва ўпартай барацьбе нашы хакеісты абыгралі каманду «Тэхнолаг» з лікам 3:0 і Гомельскага педінстытута з лікам 5:3.

## Спорт

Варта адзначыць добрыя адносіны да трэніровак і ігру студэнтаў В. Сунцова (гістфак), В. Рокшына, А. Шабана, А. Какурына (геафак), Е. Севідава (юрфак), О. Бусела, Н. Самонава (фізфак), В. Бураўскага, А. Будкевіча (біяфак).

З 10 сакавіка на стадыёне БДУ пачалося першынство універсітэта паміж факультэцкімі камандамі па хакею з мячом.

Наш. кар.

Адказны рэдактар М. І. ІОСЬКА.

АТ 04122 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Т. 22-07-19. Тыраж 2000 экз. Тыпаграфія выдавецтва «Звязда». Зак. 400.